| МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ | МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ |
|---|---|
| **ПАСТАНОВА** | **ПОСТАНОВЛЕНИЕ** |
| 11.01.2023 № 4 | |
| г. Мінск | г. Минск |

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе абзаца першага атрыкула 93, пункта 4 артыкула 96, пункта 6 артыкула 97 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзацаў другога і чацвёртага падпункта 5.13 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2022 г. № 04-01-02/11, Міністэрства культуры
ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”Б“ нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека:

”традыцыя бытавання народнага лялечнага тэатра (Мірская батлейка)“ у г.п. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці;

”традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных народных цацак-свістулек Магілёўскага Падняпроўя“ ў г. Магілёве і г. Крычаве Магілёўскай вобласці.

2. Раздзел 3 ”Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь“ Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры ад 3 студзеня 2023 г. № 1,

пасля пазіцыі

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **”Дзятлаўскі раён** | | | |
| 43АК000062 | Абрад «Юр'я» | – | в. Ахонава | А | рашэнне Рады 01.07.2009 № 156 | пастанова Савета Міністраў 21.09.2010 № 1351“ |

дапоўніць пазіцыяй

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **”Карэліцкі раён** | | | |
| 43БК000163 | Традыцыя бытавання народнага лялечнага тэатра (Мірская батлейка) | – | г.п. Мір | Б | рашэнне Рады 29.12.2022 № 04-01-02/11 | пастанова Міністэрства культуры 11.01.2023 № 4“; |

Зак. 518.

перад пазіцыяй

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | ”**Бабруйскі раён** | | | |
| 53АК000069 | Тэхналогія ганчарных вырабаў майстрамі Бабруйскага раёна | – | Бабруйскі раён | А | рашэнне Рады 22.12.2010 № 176 | пастанова Савета Міністраў 12.09.2011 № 1214“ |

дапоўніць пазіцыяй

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ”53БК000164 | Традыцыйныя вобразы і тэхналогія вырабу гліняных народных цацак-свістулек Магілёўскага Падняпроўя | – | г. Магілёў, г. Крычаў | Б | рашэнне Рады 29.12.2022 № 04-01-02/11 | пастанова Міністэрства культуры 11.01.2023 № 4“. |

Міністр А.М.Маркевіч